■ Тры пытанні да ўлады

«ЗОЛАТА» Ў ПРАЦЫ І НА ЗЯМЛІ

Сёлета на рэспубліканскім свяце хлебаробаў «Дажынкі» дэлегацыя Віцебскага раёна была адной з самых шматлікіх. Менавіта Віцебскі край стаў пераможцам у адпаведным рэйтынгу. Сёння ў раёне ствараюць «залатое кола»: вакол абласнога цэнтра наводзяць еўрапейскі лоск і распрацоўваюць незвычайныя турыстычныя маршруты.

Руслан Фурашоў.

З гэтай нагоды наш карэспандэнт задаў старшыні Віцебскага райвыканкама Руслану Фурашову тры пытанні.

— Па традыцыі, да наступных «Дажынак» пачынаюць рыхтавацца адразу пасля папярэдняга свята хлебаробаў. Хто сёлета прадстаўляў раён на «Дажынках»?

— У складзе нашай дэлегацыі на сёлетніх «Дажынках» былі сем чалавек. Гонару ўзяць удзел у свяце ўдастоіліся два сельскагаспадарчыя прадпрыемствы — ААТ «Рудакова» і «Альгоўскае», а таксама лепшыя механізатары і камбайнеры. У гэтым годзе мы атрымалі 75 тысяч тон збожжавых пры сярэдняй ураджайнасці 27,1 цэнтнера з гектара. Гэта, безумоўна, не рэкорд, бо былі нашмат лепшыя ўраджаі. Але ў агульным аб'ёме вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі па вобласці наш раён займае адно з вядучых месцаў. Спецыялізуемся на вытворчасці малака, мяса, збожжа, бульбы, гародніны. Ёсць цяплічны камбінат у адкрытым акцыянерным таварыстве «Рудакова», комплексы па вытворчасці ялавічыны ў ААТ «Ліпаўцы» і свініны ў філіяле «Лучоса» ААТ «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў», ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка».

— Руслан Васільевіч, на Віцебшчыне актыўна рэалізуецца праграма «Чыстыя палі». Што робіцца ў гэтым кірунку ў вашым раёне?

— Віцебскі раён — прыгарад абласнога цэнтра, і, зразумела, гэта абавязвае надаваць асаблівую ўвагу навядзенню парадку. У раёне сярод іншых дзейнічаюць дзве меліярацыйныя арганізацыі, якія пастаянна займаюцца выдаленнем драўнінна-хмызняковай расліннасці і павелічэннем коннтуру землекарыстання. У выніку гэты паказчык павялічылі фактычна ў два разы.

— Каб убачыць нешта цікавае, не абавязкова далёка ехаць. Чым, на ваш погляд, можа прывабіць турыстаў раён?

— У нас больш як 200 помнікаў археалогіі, у тым ліку 34 помнікі археалогіі, з іх 13 — рэспубліканскага значэння (гарадзішчы ранняга жалезнага веку). У рэспубліканскі спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў уключаны 54 помнікі гісторыі і культуры раёна. Недалёка ад Віцебска знаходзіцца маёнтак вядомага на ўвесь свет рускага мастака Ільі Рэпіна. У Віцебскім раёне, дарэчы, расце самая вялікая сасна Беларусі — каля вёскі Сушчава. Яе дыяметр — 140 сантыметраў, вышыня — каля 30 метраў, а прыкладны ўзрост — 250 гадоў. Ёсць і іншыя ўнікальныя месцы. І гэты патэнцыял трэба выкарыстоўваць.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«ДАПЛАТА НЕ ПРАВОДЗІЛАСЯ, БО БЫЛО ЗНІЖЭННЕ НАДОЯЎ»

З СВК «Прагрэс» Чэрыкаўскага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты патэлефанавала са скаргай на нізкую заработную плату адна з работніц (у рэдакцыі ёсць усе звесткі пра заяўніцу, у гаспадарцы таксама ведаюць, пра каго ідзе гаворка, але на старонках выдання мы вырашылі не ўказваць прозвішча). Жанчына працуе даяркай. Сказала, што апошняя зарплата, якую яна атрымала «чыстымі», як той казаў, на рукі, склала 1 мільён 90 тысяч рублёў...

— Гэта пры тым, што я даглядаю статак з 50-55 кароў. Акрамя таго, у мяне яшчэ шэсць цялят. Усё робім самі: і доім, і кормім, і караняплоды раздаём, і праходы на ферме пасля расчышчаем, — даводзіла нам заяўніца. Паводле яе далейшых слоў, работнікі спрабавалі высветліць, чаму ў іх такая малая зарплата. Аднак ні ад кіраўніцтва гаспадаркі, ні ад прадстаўнікоў райвыканкама, куды спрабавалі звяртацца, нічога так і не пачулі.

Мы звязаліся з упраўленнем сельскай гаспадаркі і харчавання Чэрыкаўскага райвыканкама, папрасілі разабрацца ў сітуацыі (уласна, для гэтага і патрэбна ведаць асобу заяўніка, бо інакш даць адказ на канкрэтнае пытанне немагчыма — **С.Р.**). Неўзабаве атрымалі падрабязную «раскладку» па налічэнні заработнай платы даярцы з СВК «Прагрэс» за жнівень.

Нам, у прыватнасці, паведамілі, што норма загрузкі — 46 галоў (а фактычна ў заяўніцы — 50). Расцэнкі за адзін цэнтнер малака наступныя: «экстра» ці вышэйшы гатунак — 7 242 рублі, вышэйшы гатунак ад першацёлак — 8 328 рублёў, першы гатунак — 3 621 рубель, другі гатунак — 3 000 рублёў. Даярцы за месяц агулам налічана за малако 970 432 рублі (за малако «экстра» і вышэйшага гатунку 440 530 рублёў, за першы гатунак 23 134 рублі, за вышэйшы гатунак ад першацёлак — 506 759 рублёў).

За ўтрыманне адной нецелі плацяць 4 334 рублі. «У вышэйзгаданай групе мелася 18 галоў». Выходзіць яшчэ 78 292 рублі. За прывагу аднаго цэнтнера цялят прафілактычнага перыяду да 20-дзённага ўзросту належыць выплаціць 128 018 рублёў. Аднак «у жніўні перадачы цялят 20-дзённага ўзросту ад даяркі цялятніцы не было».

Ідзём далей. «Санітарны дзень (дзяжурства) — 116 053 рублі, за працу ў выхадны дзень — 19 232 (у жніўні адроблена 28 дзён), за стаж 8 працэнтаў — 157 307». Калі скласці ўсё, улічваючы вышэйпералічанае, выходзіць 1 341 307 рублёў.

«Варта адзначыць, што надой малака ў жніўні склаў 14 180 кг, у той час як у жніўні 2012 года па гэтай групе надой складаў 15 278 кг (зніжэнне склала 1 098 кг).

У СВК «Прагрэс» у палажэнні па аплаце працы прадугледжана даплата за павелічэнне надою малака, але, паколькі адбылося зніжэнне, даплата не праводзілася.

За выкананне даведзенага задання па росце вытворчасці малака ў гаспадарцы прадугледжана прэмія ў памеры да 100 працэнтаў. На жнівень заданне складала 115,5 працэнта (ці 17 640 кг), аднак выкананне задання за гэты месяц склала толькі 80,4 працэнта (ці 3 460 кг) недабору малака да задання.

Раздача кармоў буйной рагатай жывёле даяркамі ўручную не праводзілася ў сувязі з тым, што з мая па верасень жывёла знаходзілася кругласутачна на пашы. Акрамя таго, раздача кармоў уваходзіць у абавязкі па пасадзе даглядчыкаў жывёлы».

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Страсці па амуры

У МАГІЛЁВЕ АДБЫЎСЯ АПОШНІ СЁЛЕТА ВОСЕНЬСКІ КІРМАШ

Кірмаш прайшоў яшчэ і пад «знакам» рыбы. Такіх шматлікіх чэргаў каля рыбных прылаўкаў нельга ўспомніць, бадай, з савецкіх часоў. Выгадная цана і вялікі выбар зрабілі сваю справу. Амур, таўсталобік, карп і нават фарэль знайшлі свайго спажыўца. Каля кропкі гандляроў з вёскі Сідаравічы ўжо ў 12 гадзін было пуста: тавар скончыўся. Пакупнікі, якія спазніліся, імкнуліся як мага хутчэй займаць чаргу там, дзе яшчэ пабліскваілі лускай жыхары сажалак.

Фота БЕЛТА.

Як паведамілі ва ўпраўленні гандлю Магілёўскага аблвыканкама, удзел у кірмашы прымалі больш за 30 гаспадарак з Магілёўшчыны і іншых абласцей. Заўважаны былі прадстаўнікі СВК «Рассвет» імя К. Арлоўскага, агракамбіната «Усход», Магілёўскай межрайбазы, фермерскай гаспадаркі «Куцанаў і К». Жыхары абласнога цэнтра таксама мелі магчымасць зрабіць запасы агародніны-садавіны па даступных цэнах. Напрыклад, кілаграм бульбы каштаваў каля трох тысяч рублёў, морквы — крыху больш за тры тысячы, капусты — 2,5 тысячы.

Па інфармацыі ўпраўлення гандлю аблвыканкама, у Магілёве гэта была апошняя сёлета восеньская ярмарка. Наогул за верасень-кастрычнік у вобласці прайшло 100 кірмашоў, тавараабарот якіх склаў 5,7 мільярда рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ДОБРАЕ МЕСЦА НА ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Раніцай дзеці будуць прывозіць сюды пажылога чалавека, альбо, па дамоўленасці, для яго дастаўкі ў аддзяленне будзе выкарыстоўвацца служба сацыяльнага таксі. На працягу дня для такіх людзей будзе запланавана і забаўляльная праграма, і адпачынак, і гутаркі з псіхолагамі. Будуць працаваць гурткі па інтарэсах, студыі.

Працягласць знаходжання ў такім аддзяленні на працягу дня будзе залежаць ад жадання самога старога чалавека і яго сваякоў і вар'іравацца ад некалькіх гадзін да цэлага дня. Пакуль такое аддзяленне будзе працаваць да 18 гадзін, але, калі будзе вывучаны попыт, не выключана, што часовыя рамкі змесцяць да 20 гадзін, гавораць спецыялісты.

Прапрацоўваецца і пытанне забеспячэння старых харчаваннем — з дапамогай камбінатаў школьнага харчавання або аб'яднання «Вітамін», якое гатуе ежу для бальніц. «Там гатуюць збалансаваную ежу, забяспечваюць зручную форму дастаўкі і прымальныя кошты», — кажа Ірына Дудка.

Па жаданні сваякоў можна будзе браць ежу і з сабой. У аддзяленні прадугледжаны бытавы пакой, дзе маецца пліта, халадзільнік, мікрахвалеўка. Супрацоўнікі цэнтра дапамогуць разагрэць ежу, пры неабходнасці могуць пакарміць пажылога чалавека.

— Супрацоўнікаў у аддзяленні будзе няшмат, будзем прыцягваць да працы валанцёраў, — дзеліцца планамі намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. — У нашых тэрытарыяльных цэнтрах ужо адкрыта шмат клубаў, гурткоў па інтарэсах, і мы думаем, што людзі старэйшага пакалення, тыя, хто актыўныя, хто наведвае такія гурткі і яшчэ поўныя сіл і энергіі, самі могуць выступаць у якасці валанцёраў. У нас нават ёсць такі праект — «Пажылыя — старым».

«Дзіцячы сад для старых» будзе працаваць на гасразліковай аснове. Да канца года ў Мінску плануецца адкрыць такія ж аддзяленні ў Маскоўскім, Першамайскім і Партызанскім раёнах.

❍❍❍

Гэта не новая форма работы — нашы спецыялісты пераймаюць сусветны вопыт. Так, у Германіі такія «дзіцячыя сады» для пажылых існуюць ужо не першы год. Нярэдка яны ўваходзяць у склад інтэграваных амбулаторных сацыяльных цэнтраў. Карэспандэнту «Звязды» ўдалося наведаць адзін з іх — так званую вілу «Альбрэхт», якая ўключае ў сябе, апроч такога «дзіцячага сада» для старых, 29 прыстасаваных спецыяльна для пажылых людзей кватэр, а таксама дзве групы сумеснага пражывання для людзей з дэменцыяй і дыспансер для амбулаторнага догляду.

— Што тычыцца Цэнтра дзённага знаходжання, ён у нас адкрыты кожны дзень і дазваляе разгрузіць сваякоў, калі чалавек жыве не адзін. Калі чалавек адзінокі, цэнтр дае яму магчымасць сустрэцца і пагутарыць з іншымі людзьмі, — распавядае **кіраўнік службы па арганізацыі пражывання пажылых людзей Андрэ Шпон.** — У нас ёсць уласная транспартная служба. Сваіх наведнікаў мы збіраем раніцай, а ў 16 гадзін развозім па дамах.

Тут, у самым вялікім памяшканні, збіраюцца на абед. Тут жа праходзяць усе грамадскія мерапрыемствы, — паказвае нам велізарную залу Андрэ. — А пры неабходнасці кожны госць (так супрацоўнікі называюць сваіх пажылых падапечных) можа адпачыць у асобным пакоі. Акрамя таго, часта ў хатніх умовах сваякам цяжка пасадзіць пажылога чалавека ў ванну, дапамагчы яму памыцца. У нас з гэтым усё прасцей, бо тэрыторыя цалкам безбар'ерная.

Знаходжанне ў дзённых цэнтрах выплачваецца са сродкаў страхавання на выпадак неабходнасці догляду. Хоць часам чалавеку прыходзіцца даплочваць і з уласнай кішэні, але грошы гэта невялікія.

«Ніякіх дамоў састарэлых — мы жывём на віле!» — кажуць нямецкія старыя...

Дарэчы, першапачаткова будынак вілы «Альбрэхт» служыў звычайным домам для састарэлых, які належаў Чырвонаму Крыжу. Тут жылі пажылыя людзі, якіх традыцыйна даглядалі супрацоўнікі. Але новы час патрабуе новых стандартаў. Таму на яго базе было вырашана зрабіць нешта сучаснае, з прадастаўленнем максімальных свабод людзям, якія будуць тут жыць. Будынак быў пераабсталяваны. Цяпер гэта цэлы комплекс, асноўнае прызначэнне якога — забяспечваць хатнія ўмовы жыцця для сваіх 29 арандатараў.

Адна з яго жыхарак — **88-гадовая Ленарт Шэфер,** тут ужо тры гады.

— У мяне чацвёра дзяцей. Вось яны на фотаздымках са сваімі сем'ямі, — паказвае Ленарт на здымкі, развешаныя на сцяне. — Тут у Берліне паблізу жывуць тры маіх дачкі і шэсць унукаў, яны прыходзяць да мяне пастаянна ў госці.

Мне адзін час было вельмі няпроста: моцна балела нага, да таго ж я не магла самастойна залезці ў ванну. Трэба было вырашаць, што рабіць. Хоць двое з маіх дзяцей, якія жывуць тут, у Берліне, маюць уласныя дамы і хацелі забраць мяне да сябе, я вырашыла, што буду жыць самастойна. І калі з'явілася магчымасць трапіць сюды, я на працягу двух тыдняў прадала сваю кватэру і пераехала. І не шкадую аб гэтым. Мне зручна і ўтульна тут. Тут усё прыстасавана для такіх, як я: няма парогаў, затое ёсць парэнчы ўздоўж сцен, за якія можна трымацца пры хадзе, зручная ванна, трывожная кнопка на выпадак непрадбачаных сітуацый...

У маленькай кватэрцы — спальня, гасцёўня, кухня. Кожныя два тыдні да Ленарт прыходзіць маладая жанчына, якая робіць грунтоўную прыборку, а з паўсядзённымі справамі пажылая жанчына, па яе словах, спраўляецца сама, у тым ліку сама гатуе.

Пражыванне тут каштуе 750 еўра ў месяц (без харчавання). Насамрэч яно каштуе больш, але Чырвоны Крыж атрымлівае пад гэты праект субсідыі ад дзяржавы.

❍❍❍

З пачатку гэтага года ў Беларусі ўступіла ў сілу новая рэдакцыя закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», дзякуючы якой з'явілася магчымасць рэалізацыі дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Гэта значыць, на заканадаўчым узроўні прыняты механізм прыцягнення юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў. Цяпер некамерцыйныя арганізацыі змогуць прэтэндаваць на субсідыі дзяржавы ў гэтай сферы. Будзем спадзявацца, што з цягам часу і ў нашай краіне з'явяцца такія ж камфортныя і ўтульныя «вілы», якія прыйдуць на змену цяперашнім дамам састарэлых. Але для гэтага трэба, каб пачалася практычная рэалізацыя новага закона, каб злучылі свае намаганні дзяржава (перш за ўсё органы мясцовай улады), грамадскія арганізацыі і замежныя інвестары.

Святлана БУСЬКО.

■ Складнікі поспеху

ХТО ДБАЕ — ТОЙ МАЕ

Усё пачыналася па класічнай схеме — у 1997 годзе малады маладзечанскі прадпрымальнік Алег Паліціка вырашыў стварыць прадпрыемства па вытворчасці эластычных баваўняных бінтоў. Звычайна пасляховыя бізнесмены любяць спасылацца на цяжкасці пры рэгістрацыі і адкрыцці прадпрыемства, на першыя крокі, абцяжараныя многімі перашкодамі. Але ў гэтым выпадку ўвасабленню ідэі разумнага чалавека папярэднічала доўгая карпатлівая праца па вывучэнні тэхналогіі і патрэбы ў прадукцыі. А пачыналася ўсё з трох работнікаў і аднаго ткацкага станка, прывезенага з Кастрамы. На той час рынак краіны быў надзвычай бедны на аналагічныя вырабы, ды і большасць з іх завозілася як імпарт...

Сёння Алег Паліціка, адзін з найлепшых прадпрымальнікаў сталічнай вобласці, з гонарам гаворыць, што займае да 70 працэнтаў айчыннага рынку не толькі рознага тыпу звычайных бінтоў, але і цэлай гамы іншых падобных тавараў: гэта і бінты эластычныя, і эластычныя бандажы, і вырабы для падтрымання тонусу пазваночніка і суставаў, і анатамічныя падушкі, і розныя фіксуючыя бандажы, і кампрэсійныя рукавы, і вырабы з шынамі — пералік зойме многія старонкі...

Цікавы досвед прадпрыемства мае ў тым, як заваяваць рынак: паводле слоў кіраўніка, найперш усе сілы і таленты спецыялістаў і работнікаў былі скіраваны на асваенне найбольш якасных тэхналогій, выкарыстанне выключна натуральных матэрыялаў і вывучэнне рынкаў. Магчыма, тут асаблівага наватарства не было, але факт ёсць факт: цяпер на прадпрыемстве працуе каля сотні чалавек, якія на ўласнай зарплаце спасцігілі выгаду максімальнай зацікаўленасці ў канчатковым выніку.

Наступным крокам стала не толькі замяшчэнне імпарту, але і арыентацыя на экспарт. Вось цяпер, напрыклад, палова вырабаў накіроўваецца за мяжу: у Расіі, у буйнейшых прамысловых цэнтрах — Маскве, Екацярынбургу, Смаленску, а таксама і ў іншых краінах СНД ёсць прадстаўніцтвы «Белпа-мед». Іх утрыманне — справа не танная, але так дыктуе час. Звычайная, здавалася б, рэч — прабіваць дарогу ўсё далей і далей ад Беларусі, але ўсё грунтуецца на разліку і вывучэнні рынкаў, як унутранага, так і знешніх. Беларускія ж партнёры — гэта сеткі прадпрыемстваў «Фармацыя», «Медтэхніка», рэспубліканскі пратэзна-артапедычнага цэнтр, больш за сотню камерцыйных фармацэўтычных фірмаў, артапедычныя салоны, бальніцы і медыцынскія цэнтры. І калі сёлета Мінская вобласць зберагла на імпарце каля 60 мільёнаў долараў, дык унёсак у гэтую суму маладзечанскага прадпрыемства «Белпамед» больш чым важкі.

Яшчэ адным складнікам поспеху з'яўляецца індывідуальны падыход да кожнага спажыўца — ці гэта заказ на дзясятак, ці на некалькі дзясяткаў тысяч вырабаў. Затым — жорсткія тэрміны паставак, якія бездакорна выконваюцца пры любых абставінах.

Цікава выглядае склад прадпрыемства, якое разам з усімі сваімі службамі, у тым ліку і адміністрацыйнымі, месціцца ў невялікім двухпавярховым будынку: калі раніцай на складзе бывае густа, то пад вечар — пуста.

— Па-першае — разлік, — расказвае Алег Паліціка. — Мы працуем літаральна «з рук у рукі» з кожным нашым атрымальнікам прадукцыі, таму і не выдаткоўваем на вялікія склады. Цяпер, праўда, пашыраемся, але толькі дзеля вытворчасці, бо ў Міністэрстве аховы здароўя праходзяць працэдуру зацвярджэння нашыя новыя вырабы. Якія — гэта пакуль сакрэт...

...Самі цэхі — а іх небагата, бо большасць станкоў аўтаматычныя — выглядаюць як, даруйце, школьныя майстэрні: невялікія, утульныя і вельмі цёплыя (работніцы ходзяць у лёгкім абутку, чым вельмі задаволеныя). Менавіта пра ўмовы працы кіраўнік таксама думаў ад пачатку стварэння вытворчасці.

Сёння прадукцыя «Белпа-мед» — гэта пазнавальны брэнд і якасныя, карысныя ўсім нам вырабы. І за невялікую сваю біяграфію прадпрыемства паказала, што поспех спадарожнічае тым, хто адначасова дбае пра ўвесь комплекс інтарэсаў: свае ўласныя, галіновыя і дзяржаўныя.

Пятро РАМАНЧУК

■

«Капялюшны вернісаж»

У Мінску адкрылася першая выстава галаўных убораў

Капелюшы з шоўку і воўны, скуры, тэкстылю, саломкі і бісеру — наведвальнікі выставы могуць не толькі пабачыць, але і нават прымераць упадабаныя экзэмпляры. Тут жа — капелюшы, якія насілі нашы бабулі і мамы ў 40-60-я гады.

Усяго ж на выставе прадстаўлены працы пятнаццаці майстроў з Беларусі і двух — з суседняй Расіі. Акрамя капелюшоў і іншых упрыгажэнняў для галавы, на выставе можна ўбачыць лялькі і палотны мастакоў. Але абавязковая ўмова — прысутнасць галаўнога ўбору на любым творы, выстаўленым у экспазіцыі. На ўрачыстым адкрыцці амаль усе наведвальнікі таксама былі ў разнастайных галаўных уборах.

Першая такая выстава будзе працаваць у сталічнай бібліятэцы імя Пушкіна да 10 лістапада — пры садзейнічанні Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, творчага агенцтва «Арт-Экспа», майстэрні аўтарскай лялькі і творчага праекта «Фарбы душы».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.